УДК 821.161.3-31*В. Іпатава

В. А. Каменюкова

Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт

# АДМЕТНАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ БЛІЗНЕЧНЫХ МІФАЎ У РАМАНЕ В. ІПАТАВАЙ «ЗАЛАТАЯ ЖРЫЦА АШВІНАЎ»

Артыкул прысвечаны разгляду асаблівасцей выкарыстання міфалагічнага матыву блізняцтва ў гістарычным рамане В. Іпатавай «Залатая жрыца Ашвінаў». Блізнечныя міфы асэнсоўваюцца як адна з форм мадыфікацыі феномена двайніцтва. Аўтар паслядоўна даказвае, што разарванасць светаўспрымання герояў з‟‟яўляецца мастацкай стратэгіяй пабудовы рамана. Зроблена выснова аб традыцыйным успрыняцці пісьменніцай міфалагічных матываў, што ў большай ступені абумоўлена жанравым вызначэннем твора.

Міфалагізацыя і неаміфалагізацыя шырока выкарыстоўваюцца ў літаратуры зломү тысячагоддзяў для семантычнай і кампазіцыйнай арганізацыі твора. Гэта дазваляе пісьменнікам метафарычна апісаць падзеі сучаснасці і прадстаўляе магчымасць асэнсавання літаратурнага твора на некалькіх узроўнях. У асобных выпадках суіснаванне ў межах аднаго мастацкага тэксту некалькіх фальклорных матываў можаператварыць яго ў гіпертэкст. Сѐння творцы, карыстаючыся гэтым прыѐмам, нярэдка мяняюць сэнс міфаў або ствараюць уласныя аўтарскія міфы. Згодна з Т. Шарыпінай, «у адрозненне ад ―міфалагічнага перыяду старажытнай гісторыі ў XX ст. знікае міфалагічнае стаўленне да навакольнага свету. Сферай гэтага працэсу з‘яўляецца зараз не прыродная стыхія, а сацыяльная, эмацыйная сфера жыцця чалавека. Рудыменты міфамыслення выяўляюцца і ў побытавых паводзінах» [1, с. 2]. У гэтым сэнсе выклікаюць цікавасць асаблівасці выяўлення феномена двайніцтва ў сучаснай беларускай прозе з выкарыстаннем блізнечных міфаў, у якіх заключана ідэя дуальнасці як стратэгіі светапабудовы. Дуалістычныя вобразы рэпрэзентаваны ў многіх культурах свету (Ромул і Рэм, Каін і Авель, Апалон і Артэміда, Хенгіст і Хорса і шмат іншых). Аднак 67 вядома, што старажытныя народы неадназначна ставіліся да блізняцтва. Існуе вялікі пласт міфаў, у якіх блізняты выступаюць у ролі родапачынальнікаў плямѐн. Не менш захавалася сведчанняў аб негатыўным стаўленні нашых продкаў да нараджэння блізнят. Абодва спосабы ўспрыняцця гэтай з‘явы неаднаразова абыгрываліся сучаснымі пісьменнікамі. Ужо ў назве гістарычнага рамана Вольгі Іпатавай «Залатая жрыца Ашвінаў» (2002) заяўлены яго трывалы міфалагічны падмурак. Галоўная гераіня твора Жывена (яна ж залатая жрыца, пазашлюбная дачка Міндоўга) аддадзена служыць язычніцкім багам – сонечным братам-лекарам Ашвінам. Менавіта на долю гэтай гераіні прыпадаюць самыя цяжкія выпрабаванні. Дзяўчына не спазнала бацькоўскай любові, страціла адзінага па-сапраўднаму роднага чалавека – дзядулю Агапія, які любіў і абараняў яе, адчула на сабе ўсю моц чалавечай нянавісці, далѐка ад родных мясцін зведала рабства. Менавіта праз вобраз жрыцы сцвярджаецца ідэя наканаванасці чалавечага лѐсу, разглядаецца месца чалавека ў свеце, дзе ўсѐ ўзаемазвязана і невыпадкова: «Усѐ наканаванае ўжо існуе ў будучым, жыве яно і ў мінулым пасля таго, як адбылося, бо Час не рухаецца» [2, с. 89]. Жывена вырашыла напоўніцу перажыць тыя выпрабаванні, што падрыхтаваў для яе лѐс, знаходзячы сілы ў малітвах да загадкавых Ашвінаў і адмаўляючы душэўны страх. «Трэба адужаць бяду, адолець усѐ, чым выпрабоўвае лѐс» [2, с. 150], – не аднойчы паўтарае галоўная гераіня. Але нават Жывена, выхаваная ў храме і здольная валодаць сваімі думкамі і кантраляваць учынкі, адчувае, як не проста мужна прымаць тое, што немагчыма змяніць. «Чалавек ведаў не можа не быць моцным і рашучым, бо ноша ягоная цяжкая, а шлях далѐкі» [2, с. 106], – так гучыць жыццѐвае крэда гераіні. Феномен двайніцтва ў творы В. Іпатавай шырока прадстаўлены праз вобразы блізнят. У рамане згадваюцца індаеўрапейскія братыбагі Ашвіны, хрысціянскія святыя Казьма і Даміян, заснавальнікі Рыма Ромул і Рэм, разлучаныя персанажы рамана Відэвут і Брутэн, коміт Нікіфар і памерлы дзіцѐм Алусій. Зварот пісьменніцы да міфа пра вечна юных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

братоў-блізнят абумоўлівае паслядоўную распрацоўку ў творы ідэі аб дваістасці чалавечай душы і сусвету. Увага ў рамане скіроўваецца не толькі на раўназначнасць ці перавагу духоўнага ці матэрыяльнага, а, як адзначае В. Шынкарэнка, тут «размова вядзецца пра наяўнасць некалькіх пачаткаў у адной з‘яве, пра аднолькавую каштоўнасць адрозных або супрацьлеглых, нават узаемавыключальных, элементаў нечага цэлага, што існуюць у Литературоведение 68 некалькіх іпастасях адначасова ці выступаюць адасоблена» [3, с. 115]. Іншымі словамі, міфалагічныя двайнікі тут не супрацьстаяць, а ўзаемадапаўняюць адзін аднаго, сцвярджаючы ідэю цэласнасці, гарманічнай упарадкаванасці сусвету. Цікава, што дваістасць з‘яўляецца і адметнасцю характараў персанажаў твора. Так, галоўная гераіня рамана, змучаная цяжкімі шляхамі і выпрабаваннямі, «не ў ладзе сама з сабой, раздваенне мучыла, і, прыціхлае на нейкі час, заглушанае рабствам, яно паднімалася зноў і зноў» [2, с. 175]. Жывена прымае адказнасць за жыццѐ маленькага Святазара, і зараз кожны яе ўчынак можа паўплываць на лѐс дзіцяці. Не пакідае жрыцу і вобраз Багародзіцы з маленькім дзіцѐм на руках, выяву якой яна ўбачыла ў доме коміта Нікіфара. Час, абставіны і жыццѐвы вопыт дазваляюць галоўнай гераіні з аднолькавай павагай адносіцца і да хрысціянскіх, і да паганскіх бостваў. Дзяўчына павінна выбраць: застацца на чужыне і жыць заможна ці вярнуцца на радзіму і працягнуць справу служэння людзям. Жрыца схіляецца да апошняга, але пражытае на працягу некалькіх гадоў у розных культурных асяроддзях і ў розных умовах робіць немагчымым ранейшае спакойнае і зразумелае жыццѐ: «Думкі яе раздвойваліся. Не ўсѐ магла яна цяпер даверыць старому настаўніку» [2, с. 313]. Паміж жаданнем служыць хрысціянскай веры ў манастыры і прагай улады ў Наваградку разрываецца душа іншага героя – Войшалка, сына Міндоўга. Ды і сам Вялікі князь дзеля захавання ўлады папераменна кланяецца розным багам, бо не ведае, якія з іх мацнейшыя. Такім чынам, увядзенне міфалагічнага матыву блізняцтва, з якім генетычна звязаны феномен двайніцтва, сутыкненне язычніцкага і хрысціянскага пачаткаў, сумяшчэнне культур розных народаў, паказ складанасці і супярэчлівасці чалавечых пачуццяў і адносін да рэчаіснасці ў рамане В. Іпатавай «Залатая жрыца Ашвінаў» падпарадкаваны раскрыццю ідэі натуральнага, гарманічнага суіснавання чалавека і сусвету. Пісьменніца прытрымліваецца традыцыйнага ўспрыняцця і інтэрпрэтацыі міфалагічных сюжэтаў, што абумоўлена і жанрам твора, які можна кваліфікаваць як гістарычны раман.

Спіс літаратуры

1 Шарыпина, Т. А. Восприятие античности в литературном сознании Германии XX века (троянский цикл мифов): дис. … д-ра филол. наук / Т. А. Шарыпина. – Нижний Новгород: ННГУ им. Н. И. Лобачевского, 1998. – 532 с. 69 2 Іпатава, В. Залатая жрыца Ашвінаў / В. Іпатава // Альгердава дзіда: раманы / В. Іпатава. – Мінск: Беллітфонд, 2002. – С. 7–316. 3 Шынкарэнка, В. К. Нястомных пошукаў дарога: праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы / В. К. Шынкарэнка. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 208 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ